Правапіс галосных у складаных словах

ПРЫГАДАЕМ ПРАВІЛА !

! Разгледзьце схему і ўспомніце, калі ў складаных словах у першай частцы пішацца ***а***, а калі ***о.***

а		1		
о			**2**	**3**

Выканаце **заданне 1.** Устаўце ў словы о ці а.

П..ўнапраўны, шт..хвілінна, сл..ваўжыванне, св..ечасовасць, ф..таграфія, ваг..нарамонтны, в..гнеўстойлівы, в..сьмігадовы, ш..сціствольны, тр..хдзённы, шкл..завод, д..брасуседскі, выс..кавітамінны, д..ўгалецце, ст..годдзе, гал..валомка, н..вагодні, р..знакаляровы, ст..гадовы.

! Успомніце, калі пішуцца ў складаных словах ***велік-***, а калі ***вялік-*** ?

Велік-	1		
Вялік-		2, 3…	

Заданне 2. Устаўце прапушчаныя літары і растлумачце іх правапіс:

В…лікабрытанія, в…лікасвецкі, в…лікаакіянскі, в…лікакняжацкі, в…лікагаловы, в…лікадушны, в…лікаслы.

! Разгледзьце схему і ўспомніце, калі ў складаных словах пішуцца злучальныя галосныя ***е***, ***ё***, а калі ***я.***

		е	**Ў**	2, 3…

Жыццеапісанне, вогне**Ў**стойлівы, радыебіялогія



радыялогія, жыццярадасны



радыётэхніка,

Заданне 3. Устаўце прапушчаныя літары.

Земл…праходзец, кле…варня, рады..антэна, зерн…воз, шкл…завод, д…ўгачаканы, граз…лячэбніца, земл…трус, рады…актыўны, земл…мер, рады…станцыя.

ПРАВАПІС ЗЛУЧАЛЬНЫХ ГАЛОСНЫХ

Напісанне злучальных галосных ***а, о, е, я*** падпарадкоўваецца правілам «Правапіс ***о, э, а***», «Правапіс ***е, ё, я***», якія прымяняюцца для напісання арфаграм у простых словах.



Заданне 4. Устаўце злучальныя галосныя е ці я, о ці а.

Дал_гляд, дво_ўладдзе, круг_гляд, свеж_марожаны, жыцц_апісанне, жыцц_радасны, сам_абслугоўванне, земл_ўласнік, кле_варня, два_борства, сал_варня, земл_коп, земл_трасенне,

лес_руб, зерн_ачышчальны, зерн_сховішча, кра_від, камен_драбілка, камен_ломня, карабл_крушэнне.

! *Успомніце правапіс складаных слоў з першай часткай:*

Слова –		словазлучэнне
Што –		штодзень
Фота –	Але! фатаграфія	фотаздымак
Мота –	матацыкл, матавоз	мотаспорт

Заданне 5. Устаўце прапушчаныя літары ў словах.

Д..ўгалецце – д..ўгачаканы, ч..рнабровы – ч..рнавалосы, мн..газначны – мн..ганацыянальны, п..ліфункцыянальны – п..лігамія, ф..таздымак – ф..таграфія, ст..годдзе – ст..гадовы, Н..ваполацк – Н..валукомль, д..браякасны – д..браапрацаваны, зл..памятны – зл..ўжывальны, н..ваўвядзенне – н..вамодны, м..таспорт – м..тацыкл.